**Шушкевіч, У.** У афганскім полымі / У. Шушкевіч // Лепельскі край. — 2008. — 7 кастр. — С. 1.

## У АФГАНСКІМ ПОЛЫМІ

Размешчаныя на гары муазі (баявыя ўмапцаванні з камянёў) выплёўвалі з сябе смертаносныя стрэлы мінамётных зарадаў. Міны шчыльна пакрывалі выбухамі падножжа гары. Здавалася, што мыш не праскоча паміж новаўтворнымі варонкамі. Аднак загад афганскім воінам быў канкрэтны – любой цаной захапіць муазі душманоў.

Савецкі саветнік, падпалкоўнік Уладзімір Бяляеў павінен быць прыкладам для афганскіх не зусім арганізаваных салдат, настаўнікам для іх камандзіраў. Ён знаходзіцца ў першым шэрагу наступаючых. Такія яго задача і абавязак.

Не вытрымалі душманы націску афганцаў, пакінулі першыя муазі. Уладзімір скочыў ва ўмацаванне. Ззаду пачуў выбух і адразу адчуў, як паляцеў у паветра. Ачуняў за муазі – выкінула выбуховай хваляй міны, на якой падарваўся афганскі салдат, Бяляеву толькі дробнымі камянямі пасекла твар і бок.

Палкоўніку-саветніку Патлашу пашанцавала меней. У другім муазі ён скочыў прама на міну. Адарвала нагу. Памёр ад болевага шоку.

У чарговы раз Уладзімір Бяляеў магічную сілу свайго ўратавання прыпісаў Цар-дубу, якога пасля першых падобных шчаслівых выпадковасцей пачаў лічыць сваім абярэгам. Усяго ж за час службы ў афганскім палку «Камандас» з 1982 па 1984 год саветнік быў шэсць разоў на валасок ад смерці. Тройчы праходзіў на пяць сантыметраў ад мін, на якіх падрываліся афганцы, што ішлі следам. Аднойчы скочыў з бронетранспарцёра за 15 сантыметраў ад міны, якая потым дасталася афганскаму салдату. Месяц хворы на малярыю праваляўся ў шпіталі з 40-градуснай тэмпературай. Іншыя такога не вытрымлівалі. Падпалкоўніка Бяляева Цар-дуб збярог.

Пад помнікам прыроды – Цар-дубам – у лепельскай вёсачцы Тадуліна стаяла хата Бяляевых, дзе ў 1946 годзе нарадзіўся Уладзімір. Праз тры гады бацькі з дзевяццю дзецьмі перабраліся ў Лепель, аднак за гэты час магічная сіла Цар-дуба паспела ўсяліцца ў маленькае цела Валодзі. Не было б так – шэсць разоў быць бы мёртвым воіну-інтэрнацыяналісту. А ці толькі шзсць?

Шзсць разоў Уладзімір Бяляеў бачыў смерць побач з сабой на свае вочы. А колькі яна цікавала ўпотайкі, падсцерагаючы яго ў афганскіх гарах, нават у бела-рускім мірным небе, з якога інструктар-парашутыст 737 разоў скочыў на парашуце. Не, недарэмна на яго кіцелі падпалкоўніка-адстаўніка ззяюць ордэны Чырвонай Зоркі і «Зорка» III-й ступені. Столькі вытрымаць, твар у твар сутыкаючыся са смерцю, і выжыць – сапраўдны гераізм!

Шлях Уладзіміра Бяляева да геройства быў не такі ўжо і складаны. Проста час выбраў яго, як і дзесяткі, сотні тысяч іншых савецкіх грамадзян, і кінуў у жорны чужой міжнацыянальнай заварухі. А з часам не паспрачаешся. Многія не вярнуліся з вялікага поля бітвы. Бяляева ўратаваў яго абярэг...

Уладзімір скончыў чыгуначную сямігодку (была такая ў Лепелі насупраць вакзала), затым СШ № 1. Восем месяцаў адпрацаваў памочнікам загадчыка склада на МКК. Да арміі паспеў у аэраклубе тройчы скочыць з парашутам. Таму ў 1965 годзе служыць пайшоў у паветрана-дэсантныя войскі.

Пасля трохгадовай службы ў Мар'інай Горцы ў брыгадзе спецпрызначэння застаўся старшыной роты. Пасля трох месяцаў самападрыхтоўкі экстэрнам на выдатна здаў экзамены за разведфакультэт Кіеўскага вышэйшага агульнакаманднага вучылішча. Стаў лейтэнантам. Узначаліў службу фізпадрыхтоўкі і спорту брыгады. Сам захацеў стаць камандзірам групы роты мініравання. Пяць гадоў камандаваў гэтай ротай. Затым – Афганістан.

...Пасля вяртання ў Саюз ардэнаносца Бяляева пакінулі служыць у Маскве. Скончыў курсы пры разведшколе. Папрасіўся ў Мар'іну Горку. У 1991 годзе выйшаў на пенсію. Вярнуўся ў Лепель. Жыве па вуліцы Партызанскай.

*– Уладзімір Мікалаевіч, раней не даводзілася чуць пра подзвігі афганскай армй, а вы так захапляльна распавялі пра штурм муазі…*

– У многіх афганцаў баявога духу хапала. Аднак распавяду і пра адваротны бок службы ў афганскай арміі. Мабілізацыю салдат праводзілі на базары – ачаплялі гандлёвую плошчу і хапалі запар усіх мужчын прызыўнога ўзросту. Адзін такі прызыўнік, на самой справе гарбаты, з'агітаваў усю роту дэзерціраваць. Шукай ветру ў гарах!

*– Чым цяпер займаецеся?*

– Толькі што з грыбоў вярнуўся. Люблю ціхае паляванне. У час яго душа адпачывае, нікога смерць не чакае…

**Уладзімір Шушкевіч**